**Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога**
**Бібліятэка**



# *Якуб Колас*
## *(Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч )*
## *1882-1956*

**Буклет прысвечаны**
**135-годдзю з дня нараджэння**

**Гомель 2017**

# Біяграфія

Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч ) - беларускі паэт, празаік, драматург, крытык, публіцыст, перакладчык, вучоны, педагог, грамадскі дзеяч; адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Народны паэт Беларусі (1926). Акадэмік АН Беларусі (1928). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1944).

Нарадзіўся 22 кастрычніка 1882 года ў сялянскай сям'і.

Скончыў 2-гадовае Мікалаеўшчынскае народнае вучылішча (1894). З 1898 па 1902 г. вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, дзе пісаў вершы і байкі на рускай мове, збіраў беларускі этнаграфічны і фальклорны матэрыял, пачаў пісаць па-беларуску .

Пасля заканчэння семінарыі працаваў у школах Палесся і Міншчыны. За ўдзел у настаўніцкім нелегальным з'ездзе Я. Коласа звольнілі з пасады настаўніка, а пазней асудзілі на 3 гады турэмнага зняволення (1908—1911). Пасля вызвалення з турмы настаўнічаў на Піншчыне. У 1915 г. быў мабілізаваны ў армію. Скончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча, служыў у запасным палку ў горадзе Перм, адкуль трапіў на Румынскі фронт. Там Я. Колас захварэў і неўзабаве быў эвакуіраваны ў горад Абаянь Курскай губерні, дзе і сустрэў рэвалюцыю 1917 г. У 1918—1921 гг. працаваў настаўнікам, школьным інспектарам на Куршчыне. Пасля пераезду ў Мінск (1921) выкладаў у Беларускім педагагічным тэхнікуме і БДУ, працаваў у Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы, удзельнічаў у стварэнні і працы Інбелкульта.

У 1926 г. прысуджана званне народнага паэта Беларусі.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны пераехаў з Мінска ў Клязьму, пазней — у Ташкент, дзе займаўся творчай, навуковай і грамадскай працай. Пасля вайны вярнуўся ў Мінск, дзе да 1956 г. з'яўляўся віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук.

Памёр 13 жніўня 1956 г., пахаваны на Вайсковых могілках у

# Творчасць

Творчасць Якуба Коласа — гэта працяг дэмакратычных традыцый беларускай літаратуры мінулай эпохі. Якуб Колас маляваў змрочную, прасякнутую сумам і жальбой карціну жыцця зняважанага і зняволенага мужыка. У яго першым вершы «Наш родны край», надрукаваным у 1906 г., і ў пазнейшых творах «Вёска», «Наша сяло», «Ворагам», «Мужык» і шмат іншых створана праўдзівая карціна старой жабрацкай Беларусі.

Паэзія Я. Коласа была паэзіяй тугі і смутку. Невыпадкова свой першы зборнік вершаў паэт назваў «Песні жальбы» (1910). У ім многа лірычных, шчырых вершаў пра бацькаўшчыну, пра «забыты богам край».

Пісаў і паасобныя драматургічныя творы : п'есы «Антось Лата», «На дарозе жыцця» (абедзве 1917). У гэты ж час напісана большасць апавяданняў са зборніка «Казкі жыцця» (Коўна, 1921). У 1923 годзе асобным выданнем выйшла ўрэшце скончаная паэма «Новая зямля», а ў 1925 годзе 3-я рэдакцыя паэмы «Сымон-музыка».

Тым жа часам пашыраецца тэматыка твораў Я. Коласа, ад праблемаў вёскі ён звяртаецца да гістарычнага лёсу беларускай інтэлігенцыі пачатку XX ст. Створаны вялікія празаічныя творы : «палескія аповесці» — «У палескай глушы» (Вільня, 1923) і «У глыбі Палесся» (Мінск, 1927), часткі будучай трылогіі. У 1925 годзе выйшла п'еса «Забастоўшчыкі», у чымсьці аўтабіяграфічная, пра беларускае настаўніцтва ў палітычнай барацьбе. У 1926 годзе выйшла аповесць «На прасторах жыцця» пра праблемы моладзі 1920-х гадоў.

Вершы Я. Коласа рэгулярна друкавала «Наша ніва». Выходзіць яго зборнік «Апавяданні» (Вільня, 1912), асобнымі выданнямі выйшлі апавяданні «Нёманаў дар», «Тоўстае палена», зборнік вершаваных апавяданняў «Прапаў чалавек» (усё Санкт-Пецярбург, 1913), зборнік апавяданняў шырокага тэматычнага дыяпазону «Родныя з'явы» (Вільня, 1914), п'еса «Чарка ўсё на свеце робіць» (Петраград, 1916) .

У 1920-я-1930-я гады Я. Колас актыўна займаўся перакладамі з польскай, рускай і ўкраінскай моў («Палтава» А. Пушкіна, паасобныя творы М. Лермантава, А. Міцкевіча, Т. Шаўчэнкі, П. Тычыны, Р. Тагора і інш.).

Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў шэрагу паэтычных і публіцыстычных твораў услаўляў патрыятызм і гераізм, выкрываў сутнасць нацызму. У гэты перыяд выйшлі зборнікі паэзіі «Адпомсцім» (1942), «Голас зямлі» (1943), паэмы «Суд у лесе» (1942), «Адплата» (1943—1944) і інш.

У 1954 годзе ён скончыў аповесць «На ростанях» на аснове падзей 1906—1911 гадоў, якая стала 3-й, апошняй (разам з «У палескай глушы» і «У глыбі Палесся»), часткай аднайменнай трылогіі — аднаго з першых беларускіх раманаў.


МАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІГА
ЯКУБ КОЛАС
КАЗКІ ЖЫЦЦЯ
СЫМОН-МУЗЫКА


Якуб Колас
ДРЫГВА


Якуб Колас
НА РОССТАНЯХ


ЯКУБ КОЛАС
НОВАЯ ЗЯМЛЯ


ЯКУБ КОЛАС.
ПЕСЬНІ ЖАЛЬБЫ.


Якуб Колас
XX стагоддзя
Беларуская проза
НЁМАНАЎ ДАР

# Інтэрнэт-рэсурсы

- **Беларуская палічка**
**http://knihi.com/Jakub_Kolas/**

- **Сайт Якуба Коласа**
**http://yakubkolas.ru/**

- **Літаратурна-мемарыяльны музей Я. Коласа**
http://yakubkolas.by/

- **Персональный сайт — Якуб Колас**
**http://rodnikut.ucoz.net/index/mickevich/0-17**

# Бібліяграфічны спіс

## Творы Якуба Коласа


1. Колас, Я. Збор твораў : у 14-і т. / Я. Колас. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1972-1978.
2. Колас, Я. Мой родны кут : паэзія / Я. Колас. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – 384 с.
3. Колас, Я. На ростанях : трылогія / Я. Колас. – Мінск : Юнацтва, 1981. – 702 с.
4. Колас, Я. Новая зямля : паэма / Я. Колас. – Мінск : Беларусь, 1968. – 400 с.
5. Колас, Я. Сымон-музыка / Я. Колас. – Мінск : Народная асвета, 1977. – 192 с.
6. Колас, Я. Дрыгва : аповесць. Апавяданні / Я. Колос. – Мінск : Юнацтва, 2000. – 224 с.
7. Колас, Я. Новая зямля. Сымон-музыка : паэмы / Якуб Колас. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. – 446, [2] с.
8. Колас, Я. Избранное / Я. Колас. – Москва : Правда, 1983. – 558 с.
9. Колас, Я. Стихотворения / Я. Колас. – Минск : Юнацтва, 1987. – 95 с.


## Пра пісьменніка


1. Жыгоцкі, І. М. Сэрца пакідаю вам : па коласаўскіх мясцінах / І. М. Жыгоцкі. – Мінск : Полымя, 1993. – 80 с.
2. Казбярук, У. М. Якуб Колас у школе : дапам.для выкладчыкаў бел.літ / У. М. Казбярук. – 2-е выд.,дапрац. – Минск : Народная асвета, 1975. – 176 с.
3. Казбярук, У. М. Якуб Колас : жыцце і творчасць / У. М. Казбярук. – Минск, 1962. – 36 с.
4. Купала і Колас, вы нас гадавалі : дакументы і матэрыялы / укладальнікі: В. Дз. Селяменеў, В. У. Скалабан. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 381, [2] с.
5. Купала і Колас, вы нас гадавалі : дакументы і матэрыялы / укладальнікі: В. Дз. Селяменеў, В. У. Скалабан. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012. – 333, [2] с.
6. Лужанін, М. Колас расказвае пра сябе / М. Лужанін. – Минск : Беларусь, 1964. – 320 с.
7. Навуменка, І. Якуб Колас : Духоўны воблік героя / І. Навуменка. – Минск : Беларусь, 1968. – 336 с.

8. Народныя песняры : да 90-годдзя з дня нараджэння Я.Купалы і Я.Коласа: зб.артыкулаў. – Минск : Выд. БДУ ім.У.І.Леніна, 1972. – 272 с.
9. Песняй вітаю я вас! : [Я. Колас, жыццё і творчасць] / рэдактар І. Д. Крымава. - Мінск : Беларусь, 1974. – 48 с.
10. Пшыркоў, Ю. С. Летапісец свайго народа : жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа / Ю. С. Пшыркоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 367 с.
11. Пшыркоў, Ю. С. Эпас рэвалюцыі : паэмы Я.Коласа "Новая зямля" і "Сымон-музыка", трылогія "На ростанях" / Ю. С. Пшыркоў. – Минск : Вышэйшая школа, 1975. – 240 с.
12. Тамашова, Л. Ф. Вывучэнне паэмы Я.Коласа "Новая зямля" ў школе / Л. Ф. Тамашова. – 2-е выд. – Минск : Народная асвета, 1974. – 96 с.
13. Тамашова, Л. Ф. Вывучэнне трылогіі Я.Коласа "На ростанях " у школе / Л. Ф. Тамашова. – 3-е выд.. –Минск : Народная асвета, 1976. – 112 с.
14. Якуб Колас у творчасці мастакоў = Якуб Колас в творчестве художников : альбом рэпрадукцій / склад. Ю. А. Карачун. – Мінск : Беларусь, 1982. – 103 с.
15. Ярош, М. Р. Янка Купала і Якуб Колас : Параўн. аналіз творчасці / М. Р. Ярош. – Минск : Навука і техніка, 1988. – 192 с.
16. Александрович, С. Х. От родной земли... : повесть о дет.и юнош.годах Я. Коласа / С. Х. Александрович. – Минск : Беларусь, 1966. – 312 с.
17. Лужанин, М. Якуб Колас рассказывает... / М. Лужанин. – Москва : Советский писатель, 1964. – 400 с.
18. Майхрович, А. С. Янка Купала и Якуб Колас : вопросы мировоззрения / А. С. Майхрович. – Минск : Наука и техника, 1982. – 248 с.
19. Мозольков, Е. С. Якуб Колос : крит.-биограф.очерк / Е. С. Мозольков. – Москва : Советский писатель, 1960. – 203 с.
20. Науменко, И. Я. Янка Купала. Якуб Колас : творческие портреты / И. Я. Науменко ; пер.с бел. В. Жиженко. – Москва : Советский писатель, 1982. – 287 с.
21. Родионов, В. Н. Якуб Колас-педагог / В. Н. Родионов. – Минск : Изд. БГУ им. В. И. Ленина, 1981. – 144 с.

## Артыкулы з кніг и часопісаў

1. Вядомы і невядомы Якуб Колас : вобраз народнага паэта ў фотаздымках БЕЛТА // Беларуская думка. – 2017. – № 10. – С. 34–35.
2. Вярыцкая, В. Гістарычны дыскурс у творчай спадчыне Якуба Коласа = Hictorical Discourse in the Oruivre of Jakub Kolas : да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа

і Я. Купалы / В. Вярбіцкая, А. Смолік // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 11. – С. 25–32.
3. Гніламедаў, У. В. Спадчына паэта : да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа і Я. Купалы / У. В. Гніламедаў // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2012. – № 1. – С. 4–16.
4. Жолуд, С. "Сабачы хлеб" нёманскіх плытагонаў : на падставе чаго Якуб Колас стварaў свой верш "Плытнікі"? / Сяргей Жолуд // Беларуская думка. – 2017. – № 10. – С. 41–45.
5. Жураўлёў, В. "Заўтрашні дзень" як альтэрнатыўная праблема ў творах Якуба Коласа : 125-год з дня нараджэння Якуба Коласа / В. Жураўлёў // Полымя. –2007. – № 11. – С. 110–117.
6. Зэкаў, А. "Стаіць мая хата між хвой кучаравых..." : 125-год з дня нараджэння Якуба Коласа / Анатоль Зэкаў // Полымя. – 2007. – № 11. – С. 93–96.
7. Іофе, М. Д. Гучыць народу твой любы голас / М. Д. Іофе // Беларусь в современном мире : материалы II Республиканской научной конференции студентов, магистрантов и аспирантов, г. Гомель, 15 мая 2009 г. – Гомель, 2009. – С. 95–98.
8. Казлова, В. Эпісталярная спадчына Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны : 125-год з дня нараджэння Якуба Коласа / Вольга Казлова // Полымя. – 2007. – № 11. – С. 97–102.
9. Камароўская, З. Пад небам Песняра / З. Камароўская ; [гутарыў С. Галоўка] // Беларуская думка. – 2012. – № 10. – С. 84–92.
10. Каўко, А. Незабыўнае : да 125-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа / А. Каўко // Маладосць. – 2007. – № 11. – С. 103–104.
11. Макарэвіч, В. Якуб Колас у Парыжы : імпрэсія / В. Макарэвіч // Полымя . – 2009. – № 2. – С. 49–62.
12. Міцкевіч, С. Родны кут Якуба Коласа : погляд у мінулае / Соф'я Міцкевіч // Маладосць. – 2007. – № 6. – С. 100–109.
13. Мушынскі, М. "На шляхах волі"- вершаваны раман Якуба Коласа: да 125-годдзя Якуба Коласа / Міхась Мушынскі // Полымя. – 2007. – № 8. – С. 157–171.
14. Самовіч, А. Л. Родны кут : Янка Брыль пра сустрэчы з Якубам Коласам / Аляксандр Самовіч // Беларуская думка. – 2017. – № 10. – С. 36–40.
15. Скалабан, В. Невядомыя лісты Якуба Коласа 1941 г. / Віталь Скалабан, Мар'яна Тумаш // Полымя. – 2006. – № 11. – С. 160–164.
16. Суарэс, Л. І. Якуб Колас — народны паэт і настаўнік / Л. І. Суарэс // Веснік адукацыі = Вестник образования. – 2012. – № 10. – С. 61–67.
17. Шаладонава, Ж. С. У глыбіні вобраза: міфалагічны аспект асэнсавання смерці Міхала у паэме Я.Коласа "Новая зямля" / Ж.С. Шаладонава // Весці АНБ. Сер. гуманітарных навук. – 1996. – № 1. – С.91–97.

18. Шаладонаў, І. Выпрабаванне на чалавечнасць (паводле апавядянняў Якуба Коласа 1920-х гадоў") : 125-год з дня нараджэння Якуба Коласа / Ігар Шаладонаў // Полымя. – 2007. – № 11. – С. 118 –126.
19. Шамякіна, А. Прастора ў трылогіі Якуба Коласа "На ростанях" : 125-год з дня нараджэння Якуба Коласа / Алеся Шамякіна // Полымя. – 2007. – № 11. – С. 103–109.
20. Шамякіна, М. Да калыскі Коласа : 125-год з дня нараджэння Якуба Коласа / Марыя Шамякіна, Сабіна Пятро // Полымя. – 2007. – № 11. – С. 81–92.
21. Шур, В. Асаблівасці анамастыкону аповесці Якуба Коласа "Дрыгва" : да 125-годдзя нараджэняя Якуба Коласа / Васіль Шур // Маладосць. – 2007. – № 8. – С. 114–119.
22. Агиевич, В. В каждой строке - жизнь : к 125-летию со дня рождения Якуба Коласа / В. Агиевич // Наш современник. – 2007. – № 12. – С. 267–269.
23. Агиевич, В. В каждой строке - читай - жизнь : к 125-летию со дня рождения Якуба Коласа / В. Агиевич // Нёман. – 2007. – № 12. – С. 140–143.
24. Жигоцкий, Н. "Дрыгва" и дед Талаш : к 125-летию со дня рождения Якуба Коласа / Н. Жигоцкий // Нёман. – 2007. – № 12. – С. 144–153.
25. Колас Якуб = Kolas Yakub // Гордость земли белорусской. – Минск, 2015. – С. 39–40.
26. Станкевич, Р. "Мир неповторимый и волнующий" : поэзия Я. Купалы и Я. Коласа в переводах на болгарский язык : к 125-летию со дня рождения Я.Купалы и Я.Коласа / Роза Станкевич // Всемирная литература. – 2007. – № 5. – С. 143–78.
27. Шабельцев, С. В. Якуб Колас и Янка Купала — символы белорусов в Аргентине / Сергей Шабельцев // Беларуская думка. – 2017. – № 10. –С. 46–50.
28. Якуб Колас смеется, заботится, помогает... : к 125-летию со дня рождения Якуба Коласа / Пер. с бел. М.Журавины // Нёман. – 2007. – № 6. – С. 174–182.

**З літаратурай, прадстаўленай у буклеце, можна азнаёміцца ў бібліятэцы ГДТУ ім. П.В. Сухога.**

Аддзел даведачна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай работы бібліятэкі ГДТУ ім. П.В. Сухога

# Помнікі




в. Люсіна
(памятны знак)




г. Ганцэвічы



г. Мінск




г. Пінск
(памятная дошка)



# *Якуб Колас*

## *(Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч )*

## *1882-1956*